ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 1 (1227) ● 11 студзеня 1979 г. Цана 2 кап.

## УКАЗ

### ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

**Аб узнагароджанні ордэнамі і медалямі СССР работнікаў Акадэміі навук Беларускай ССР, якія найбольш вызначыліся.**

**За поспехі ў развіцці навукі ўзнагародзіць:**

**ОРДЭНАМ ЛЕНІНА**

**БЕЛАГА Уладзіміра Аляксеевіча — акадэміка Акадэміі навук Беларускай ССР.**

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
Л. БРЭЖНЕЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
М. ГЕАРГАДЗЕ.

Партыйнае жыццё

## Вывучаем матэрыялы Пленума

У партыйных арганізацыях універсітэта працягваецца вывучэнне матэрыялаў лістападаўскага (1978 г.) Пленума ЦК КПСС.

На сваіх сходах камуністы вызначаюць задачы, якія паўстаюць перад імі ў святле рашэнняў Пленума і ўказанняў, выкладзеных у выступленні на Пленуме Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР тав. Л. І. Брэжнева.

Неабходна адзначыць, што ў большасці партарганізацый сходы прайшлі арганізавана, пры высокай актыўнасці камуністаў.

Так, на факультэце журналістыкі ў спрэчках па дакладу «Задачы партарганізацыі журфака, вынікаючыя з рашэнняў лістападаўскага (1978 г.) Пленума ЦК КПСС і ўказанняў Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР тав. Л. І. Брэжнева, якія ён даў на Пленуме», які зрабіў дацэнт журфака І. І. Сачанка, выступіла каля дзесяці чалавек. У сваіх выступленнях камуністы сканцэнтравалі ўвагу на злабадзённых пытаннях сваёй штодзённай работы, намецілі планы на будучае.

Пры высокай актыўнасці камуністаў прайшлі сходы і ў партарганізацыях хімічнага, філалагічнага і іншых факультэтаў.

**Л. АНДРЭЕВА.**

**«Партыйным камітэтам... трэба паклапаціцца аб тым, каб данесці ідэі, вывады і задачы, сфармуляваныя ў «Цаліне», да свядомасці ўсіх працоўных. Важна, каб абмеркаванне і вывучэнне кнігі ў працоўных калектывах, у навучальных установах, па месцу пражывання насельніцтва, ва ўсіх формах партыйнай і камсамольскай вучобы, эканамічнай адукацыі цесна ўвязвалася з вырашэннем працаўнікамі горада і вёскі канкрэтных гаспадарча-эканамічных задач...»**

**(П. М. МАШЭРАЎ)**

## УРОКІ ЦАЛІНЫ— УРОКІ ГІСТОРЫІ

Пяты паверх галоўнага корпуса. Тут у 522 аудыторыі сабраліся студэнты II курса гістарычнага факультэта аддзялення філасофіі. На дзвярах аб'ява аб чарговым пасяджэнні клуба «Дыялог». Тэма размовы: «Урокі цаліны—урокі гісторыі» па кнізе Л. І. Брэжнева «Цаліна».

Гісторыя клуба небагатая. Ён створан у пачатку гэтага навучальнага года па прапанове Лёні Свярдлова і Валерыя Залатара — студэнтаў II курса гістфака аддзялення філасофіі. «Дыялог» аб'яднаў самых дапытлівых і эрудзіраваных. Зараз усе цікавыя пытанні выносяцца на расшыраныя пасяджэнні, на якіх могуць прысутнічаць усе жадаючыя.

Пачалося пасяджэнне. Старшыня Марына Сомава прадставіла госця дыялогаўцаў Уладзіміра Фядотавіча Бяркова. Некалі разам з іншымі студэнтамі ён на працягу трох месяцаў працаваў на асваенні зямель Паўночнага Казахстана.

— Многае сцерла ў памяці неасцярожная рука часу, але калі-нікалі прыходзяць на ўспамін некаторыя эпізоды,— пачаў Уладзімір Фядотавіч.

Цішыня ў зале. Зацікаўленыя позіркі юнакоў і дзяўчат. Мабыць зараз яны бачаць і тыя цяплушкі, у якіх ехаў з сябрамі Уладзімір Фядотавіч, і тое бязбрэжжа цалінных зямель, дзе на сотні кіламетраў не ўбачыш ніводнага паселішча.

Яны адчуваюць подых таго гераічнага часу, калі ў барацьбе за хлеб цаліны мацнела дружба беларусаў і ўкраінцаў, казахаў і рускіх.

— Цяжкім было змаганне, але яно дапамагло нам самаўпэўніцца, адчуць, што мы здольны на значныя справы. «Ёсць хлеб — будзе і песня...» — гэтыя словы з кнігі Л. І. Брэжнева «Цаліна» раскрываюць веліч той задачы, якую ў складаных умовах выканалі цаліннікі,— закончыў размову У. Ф. Бяркоў.

Працягам яго апавядання з'явілася выступленне студэнткі Святланы Марозавай, якая раскрыла актуальнасць праблем, пастаўленых Л. І. Брэжневым у сваіх успамінах:

— Цаліна — гэта школа гісторыі, школа жыцця. У нашай рэспубліцы ёсць свая «цаліна» —гэта Магілёўская, Віцебская вобласці, паўночныя раёны Мінскай і Палессе. Каб рашыць праблему беларускай «цаліны», трэба ўзяць на ўзбраенне вопыт Паўночнага Казахстана.

На трыбуне студэнт са Шры-Ланка Пілсэн Бадал. Ён ацаніў кнігу Л. І. Брэжнева як вобразны прыклад будаўніцтва сацыялістычнага грамадства, як новы ўклад у міралюбівую палітыку нашай дзяржавы.

Пасяджэнне закончана. Наперадзе — новыя сустрэчы, цікавыя абмеркаванні.

**М. ДАБЖЫНСКАЯ.**

Насустрач выбарам

## Наперадзе— камуністы

Пачатак цяперашняй выбарчай кампаніі супаў з вялікім і радасным святам у жыцці беларускага народа — 60-годдзем БССР і КПБ. Разам з усім савецкім народам працоўныя Беларусі сустракаюць выбарчую кампанію высокімі працоўнымі дасягненнямі, вялікім палітычным уздымам.

У гэтым годзе выбары ў Вярхоўны Савет СССР упершыню будуць праходзіць на аснове новай Канстытуцыі, Закона аб выбарах у Вярхоўны Савет СССР. Выбарчая кампанія стане буйной падзеяй у грамадска-палітычным жыцці краіны, зноў з усёй сілай прадэманструе непарушнае адзінства партыі і народа, трыумф сацыялістычнай дэмакратыі.

Вялікая арганізацыйная работа па падрыхтоўцы да выбараў вядзецца ва універсітэце. Партыйная арганізацыя БДУ — галаўная па правядзенню агітацыйна-прапагандысцкай работы на выбарчых участках № 30/77 і 34/81.

Дзве ўчасткова-выбарчыя камісіі, створаныя ў БДУ, узначальваюць дацэнт М. М. Пасноў і начальнік аддзела кадраў НДІ фізіка-хімічных праблем Ю. М. Іскра.

Вызначаны загадчыкі агітпунктаў і агіткалектываў. Імі сталі В. П. Давыдаў, М. І. Сашко, К. М. Бакіноўскі, М. Ф. Піліпенка.

На пасяджэнні партыйнага камітэта універсітэта быў абмеркаван і зацверджан план работы агіткалектываў і агітпунктаў.

**І. САВЕТКІНА.**



**Структура арганізатарскай дзейнасці, методыка падрыхтоўкі і правядзення камсамольскага сходу, сацыяльна-псіхалагічны клімат у калектыве, інфармацыйная работа ў камсамоле, праблема фарміравання новага чалавека і ідэалагічная барацьба — вось толькі некаторыя з тых пытанняў, якія абмяркоўваюцца на занятках школы камсамольскага актыву гістарычнага факультэта, за работу якой адказвае член камітэта камсамола факультэта, студэнт III курса аддзялення палітэканоміі Сяргей Гнацюк.**

**Чарговыя заняткі школы былі прысвечаны пытанням арганізацыі і планаванню камсамольскай работы, асобе камсамольскага актывіста. З рэкамендацыямі выступіў загадчык сектара грамадска-палітычнай практыкі і Ленінскага заліку пры камітэце камсамола БДУ, выкладчык кафедры філасофіі ІПК У. М. Карагін.**

**У спісах слухачоў школы 75 актывістаў факультэта, але на занятках прысутнічае звычайна больш за 100 чалавек — прыходзяць студэнты з юрфака, факультэта журналістыкі і іншых факультэтаў. Тыя, хто праслухае гадавы цыкл лекцый і паспяхова здасць залік, атрымаюць спецыяльнае пасведчанне.**

Фота Д. Прэса.



М. Ф. Малаковіч.



Б. З. Каган (унізе справа).

**Вайна... Хутка 34 гады, як яна скончылася. Але яшчэ доўга ў памяці людской будуць жыць успаміны. Доўга будуць аддавацца болем у сэрцы вобразы родных і блізкіх, якія не вярнуліся дамоў, якім не суджана цяпер бачыць сонца, сустракаць вёсны, кахаць... Яны не пашкадавалі самага дарагога — сваіх жыццяў, таму што верылі ў перамогу, хацелі, каб нам з вамі жылося свабодна і шчасліва. І мы жывем... Толькі ўспаміны не даюць супакоіцца. Мы ўсё часцей і часцей звяртаемся да мінулага, хочам даведацца аб ім як мага больш. Гэта натуральнае імкненне нашай моладзі. І вось на розных факультэтах нашага універсітэта створаны групы «Доўг», «Пошук». Гады карпатлівай работы далі добрыя вынікі: устаноўлены дзесяткі імёнаў былых студэнтаў і выкладчыкаў БДУ, якія мужна змагаліся з ворагам у гады Вялікай Айчыннай. Знойдзены фатаграфіі, узноўлены эпізоды гераічнай барацьбы. Пошук працягваецца...**

# Вяртанне з невядомасці

— Мы сабраліся тут, каб аддаць грамадзянскі наш доўг, ушанаваць памяць герояў, былых выкладчыкаў, студэнтаў і супрацоўнікаў Мінскага юрыдычнага інстытута (МЮІ), якія да апошняй кроплі крыві былі верныя Радзіме, партыі, народу,— сказаў у пачатку мітынгу дацэнт кафедры грамадзянскага права, сакратар партарганізацыі юрфака Адам Адамавіч Шынгель.

Сівыя скроні, бляск узнагарод факультэцкіх ветэранаў і гасцей змешваюцца з узрушанай маладосцю студэнтаў, якія прысутнічаюць на мітынгу. У вачах старэйшых — памяць аб цяжкіх гадах выпрабавання, аб сябрах, аб перажытым, у вачах малодшых — павага да гэтай памяці.

Сёння на ганаровую Дошку памяці, што размешчана ў фае юрфака, заносяцца новыя імёны, якія ўстаноўлены членамі факультэцкай групы «Пошук». Першы запіс на мемарыяльнай дошцы зроблен у 1977 годзе.

Вайсковы аркестр перакрывае галасы прысутных, і адразу ўсталёўваецца цішыня. Гучаць гімны СССР і БССР, а потым малады, моцны, чысты голас закранае кожнае сэрца ўрачыстымі словамі аб тых, хто «пайшоў не дакахаўшы, не дакурыўшы апошняй папяросы...»

Мітынг адкрывае ветэран вайны Іосіф Ісакавіч Гарэлік:

— Партыйнае падполле ў Мінску ўзнікла з першых месяцаў фашысцкай акупацыі. Кіруючыся ўказаннямі партыі, камуністы і камсамольцы, якія засталіся ў акупіраваным ворагам горадзе, арганізавалі падполле. Як сведчаць матэрыялы Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ і Інстытута АН БССР, у ліку першых узнікла «група выкладчыкаў і студэнтаў МЮІ».

Іосіф Ісакавіч называе герояў, імёны якіх ужо занесены на мемарыяльную дошку:

— 1942 год. Ад ран, атрыманых у перастрэлцы з гестапаўцамі, памёр член Мінскага падпольнага гаркома партыі Васіль Сцяпанавіч Жудро.

Верасень 1942 года. Узарваў гранатай ворагаў і падарваўся сам сакратар камітэта камсамола МЮІ, партызан Дзмітрый Аляксеевіч Рэпін.

Лістапад 1942 года. Закатавалі выкладчыцу крымінальнага працэсу Антаніну Аляксееўну Сакалову.

1942 год. У баях пад Смаленскам загінуў студэнт IV курса Азарноў...

Іосіф Ісакавіч ад імя ветэранаў вайны паабяцаў працягваць пошукавую работу да той пары, пакуль не будуць вырваны з невядомасці ўсе імёны загінуўшых.

Змена ганаровай варты. Камсамольцы здымаюць з мемарыяльнай дошкі чырвонае палатно. Залатымі літарамі загарэліся на ёй новыя імёны і прозвішчы: Вера Андрэеўна Бялятка, Міхаіл Паўлавіч Мельнік, Мікалай Пятровіч Пікуль, Аляксей Міхайлавіч Фралоў, Міхаіл Ільіч Эпштэйн.

Хвіліны маўчання. Застылі на вачах у ветэранаў слёзы. Піянеры салютуюць героям. Да мемарыяльнай дошкі ўскладаюцца пунсовыя гваздзікі.

Ветэран апошняй вайны, дэкан юрыдычнага факультэта, прафесар Васіль Фёдаравіч Чыгір напомніў прысутным, што ёсць яшчэ ў свеце людзі, якія жадаюць вайны, выношваюць захопніцкія планы, распрацоўваюць нейтронную бомбу. Але яны не ўлічваюць сілу і моц патрыятызму савецкага народа, непарушную веру яго ў перамогу міру на ўсёй зямлі.

На трыбуну ўзнімаецца былы студэнт МЮІ, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, адвакат Франц Генрыхавіч Імбра:

— І сёння ў памяці жывуць вобразы маіх сяброў Веры Бялятка, Барыса Кагана...

Голас зрываецца, цяжка стрымаць боль.

— Уяўляю іх па-ранейшаму прыгожымі, маладымі, жывымі...

Кіраўнік групы «Доўг» універсітэта Зінаіда Мельнік паведамляе, што ў аперацыі «Доўг» удзельнічаюць звыш 200 студэнтаў розных факультэтаў. Імі ўстаноўлены ўжо імёны больш шасцісот студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта, Мінскага юрыдычнага інстытута і Камуністычнага інстытута журналістыкі, якія загінулі ў гады вайны.

— Наша мэта, — гаворыць Зінаіда, — стварэнне кнігі Памяці, дзе будуць змешчаны нарысы, расказы аб героях, якія пайшлі са сцен універсітэта на франты Вялікай Айчыннай і не вярнуліся.

Сакратар партарганізацыі юрфака Адам Адамавіч Шынгель віншуе прысутных са святам 60-годдзя БССР і КПБ, жадае добрага здароўя і мірнага неба.

Гімнамі СССР і БССР заканчваецца мітынг.

**Л. ЯЦЭВІЧ.**



Г. М. Гейфман.



Л. І. Мітрафанаў.



А. Д. Азарноў.



М. В. Марцючэнка.



М. І. Эпштэйн.

## Нашы юбіляры

# У ПАСТАЯННЫМ ПОШУКУ

Аб чым думае студэнт, калі ідзе на залік або экзамен? Цяжка сказаць... Хутчэй за ўсё аб тым, як бы лепш адказаць на пытанні білета, каб у залікоўцы паявілася жаданая адзнака.

Як адчувае сябе студэнт у час адказу? Напэўна, гэта ўжо цалкам залежыць ад таго, які прадмет здаеш. Калі вывучэнне яго прыносіць табе радасць пазнання і творчасці, калі захапляе і авалодвае тваімі думкамі і пачуццямі, тады можна сказаць, што размова з выкладчыкам будзе цікавай.

Звычайна выкладчыкі адразу заўважаюць такіх неабыякавых, з імі заўсёды цікава працаваць. У Дзмітрыя Міхайлавіча Каруліна, прафесара кафедры глебазнаўства і геалогіі геаграфічнага факультэта, таксама ёсць такія вучні. Гэта і студэнт трэцяга курса Алег Лукашоў, які піша пад яго кіраўніцтвам навуковую работу «Сучаснае ападканакапленне ў Балтыйскім моры», і Яўген Марозаў (тэма яго работы — «Карысныя выкапні Беларусі»). А студэнтка-завочніца Валянціна Аляшкевіч піша сваю дыпломную работу «Геолага-геамарфічнае апісанне раёна верхняга цячэння ракі Нёман». Гэта лепшыя з яго цяперашніх вучняў. А колькі іх, калісьці захапіўшыхся геалогіяй, ужо шмат гадоў працуюць у гэтай галіне навукі! Нават успомніць усіх цяжка... Затое яны яго памятаюць. Нядаўна Дзмітрый Міхайлавіч адзначаў свой сем дзесяцігадовы юбілей. Цэлы стос віншавальных тэлеграм атрымаў ён з розных куткоў краіны, з розных навуковых і навучальных устаноў, ад сваіх калег, большасць якіх — яго былыя вучні. У адным з віншаванняў сказана: «Ваша шматгранная дзейнасць на карысць Радзімы з'яўляецца ўзорам камуністычных адносін да выканання свайго доўгу чалавека і грамадзяніна нашай вялікай краіны».

Шматгранная працоўная дзейнасць...

Хлопец з рабочай сям'і некаторы час працаваў электраманцёрам. Потым паступіў у Ленінградскі горны інстытут, выдатна скончыў яго ў 1935 годзе. Дваццаць гадоў працы ў розных геалагічных арганізацыях на розных пасадах (геолаг, начальнік партыі і экспедыцыі, галоўны інжынер трэста і геалагічнага ўпраўлення). Вайна. Потым работа ў Краснаярскім краі ў якасці начальніка экспедыцыі (за паспяхова праведзеную тут работу ўзнагароджан медалём «За працоўную доблесць»), пасля чаго быў запрошан на вучобу ў Акадэмію вугальнай прамысловасці СССР, абарона дысертацыі па тэме «Методыка разведкі рассыпных месцанараджэнняў алмазаў Усходняй Сібіры».

На выкладчыцкую работу Дзмітрый Міхайлавіч прыйшоў, калі яму было сорак сем гадоў. Яму, чалавеку з вялізным вопытам практычнай работы, было што перадаць моладзі. Займаючыся педагагічнай дзейнасцю, Д. М. Карулін вядзе і вялікую навукова-даследчую работу. Неаднаразова выязджае са студэнтамі-практыкантамі «ў поле», як гавораць геолагі, працуе над вывучэннем недраў нашай рэспублікі. Вынікам пошукаў і назіранняў вучонага з'явіўся вучэбны дапаможнік для студэнтаў па вывучэнню геалагічнай будовы рэспублікі і багацця яе недраў «Геалогія і карысныя выкапні Беларусі». У 1973-74 гадах Дзмітрый Міхайлавіч па заказу Міністэрства асветы БССР падрыхтаваў для сярэдняй школы шэраг вучэбных дапаможнікаў.

Вялікае значэнне для развіцця народнай гаспадаркі Беларусі мелі даследаванні Дзмітрыя Міхайлавіча. Ён прымаў актыўны ўдзел у пошуках нафты ў нашай рэспубліцы. Для развіцця вугальнай прамысловасці БССР, бясспрэчна, мела значэнне яго кніга «Геалагічная будова і вугляноснасць беларускага Палесся». Дзмітрый Міхайлавіч дае ацэнку сыравіннай базы для цэментнай, вапнавай, сілікатнай, керамічнай прамысловасці. Усяго Д. М. Каруліным апублікавана 82 навуковыя работы (11 кніг, 2 брашуры, артыкулы), маючых практычнае значэнне для народнай гаспадаркі Беларусі. За шматгадовую паспяховую працу Д. М. Карулін узнагароджан медалём «За доблесную працу», знакам «Ударнік дзевятай пяцігодкі», ганаровымі граматамі. Пяцьдзесят тры гады вытворчай, навуковай і педагагічнай дзейнасці — гэта штодзённая нялёгкая праца, пастаянны пошук.

**В. ШАЛІЎСКАЯ.**

# СЕСІЯ ВАЧЫМА ПЕРШАКУРСНІКА

Слава Коўш — студэнт I курса гістфака. Але гэта няважна. Важна тое, што ён прадстаўнік наіўнага яшчэ, дасесійнага племені першакурснікаў. Сесія — чарговы бар'ер у іх жыцці. Як яны падышлі да яе? Чаго чакаюць ад гэтага першага студэнцкага выпрабавання?

**— Што такое сесія ў тваім уяўленні?**

— Напэўна, набліжэнне сесіі кожны можа адчуць сугуба індывідуальна. Рэзка ламаецца рытм звыклага жыцця, мяняюцца ўстойлівыя звычкі. І чым раней пачнуцца гэтыя змены, тым раней да цябе прыйдзе сесія. Асабіста я яе баюся. І не таму, што не ўпэўнен у сваіх ведах, але да ўсяго новага, раней не зведанага ставішся з насцярожанасцю.

**— Чаго ты чакаеш ад сесіі?**

— Думаю, сесія дапаможа мне лепш даведацца аб самім сабе, выявіць узровень маіх ведаў. Лічу, што падрыхтоўка да сесіі павінна ісці з першага дня вучобы. Але, на жаль, на практыцы гэта не кожнаму ўдаецца здзейсніць. Бо акрамя асноўных заняткаў у нас яшчэ і розныя грамадскія, спартыўныя мерапрыемствы. А яшчэ

# ЗОЛАТАМ НА МАРМУРЫ

Калі пачалася вайна, выкладчыкі і студэнты Мінскага юрыдычнага інстытута (цяпер юрыдычнага факультэта БДУ) разам з усім савецкім народам усталі на абарону сваёй Радзімы. Яны змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у партызанскіх атрадах, камуністычным падполлі.

У артыкуле «Аб партыйным падполлі ў Мінску ў гады Вялікай Айчыннай вайны», надрукаваным у часопісе «Коммунист Белоруссии», сказана: «Партыйнае падполле ў Мінску ўзнікла з першых жа месяцаў фашысцкай акупацыі горада... Як сведчаць дакументы і матэрыялы, у ліку першых у горадзе ўзніклі:

...група выкладчыкаў і студэнтаў юрыдычнага інстытута — Р. М. Бромберг, М. Ф. Малаковіч, М. Б. Осіпава, А. А. Сакалова і інш.

Многія з іх загінулі.

**Вера Бялятка** — студэнтка II курса аказалася першай у спісе выкладчыкаў і студэнтаў Мінскага юрыдычнага інстытута, якія загінулі ў барацьбе з фашызмам. Яна была забіта варожай бомбай 25 чэрвеня 1941 года ў час абарончых работ пад Мінскам.

У жніўні 1941-га ў жорсткіх баях пад Ельняй загінуў **Барыс Каган** — студэнт III курса, зампаліт, родны брат беларускай паэтэсы Эдзі Агняцвет.

У наступным месяцы загінуў **Лаўрэнцій Мітрафанаў** — студэнт IV курса, радавы.

Яго аднакурснік і сябар, палітрук **Арон Азарноў** загінуў пад Смаленскам у 1942 годзе.

**Васіль Жудро** быў студэнтам II курса. Ён паступіў у інстытут пасля службы ў Чырвонай Арміі, дзе стаў камуністам. У акупіраваным Мінску ён быў членам падпольнага гаркома КПБ.

У час перастрэлкі з гестапаўцамі, якія спрабавалі схапіць яго на явачнай кватэры, выдадзенай здраднікам, Жудро быў цяжка паранен. 20 красавіка 1942 года ён памёр ад ран.

2 чэрвеня 1942 года ў час транспарціроўкі ў шпіталь пасля цяжкага ранення ў баі памёр **Уладзімір Срэценскі** — студэнт IV курса, радавы.

**Дзмітрый Рэпін** — студэнт IV курса быў сакратаром камітэта камсамола інстытута, актыўны ўдзельнік Магілёўскага камуністычнага падполля, партызан. У адным з баёў яго акружылі карацелі, але не здаўся мужны партызан: ён падарваў гранатай сябе і ворагаў. Гэта было ў верасні 1942-га.

У гэты ж час загінуў яго аднакурснік і сябар **Пётр Савацееў** — актыўны ўдзельнік Бабруйскага камуністычнага падполля, партызан.

Загінуў у баі ў гэтыя ж дні актыўны ўдзельнік Мінскага камуністычнага падполля, партызан — студэнт II курса **Мацікс Столаў**.

У лістападзе 1942 года ў мінскіх засценках гестапа загінула актыўная ўдзельніца Мінскага камуністычнага падполля, выкладчык крымінальнага працэсу **Антаніна Аляксееўна Сакалова.**

Студэнт III курса **Мікалай Пікуль,** старшы лейтэнант, быў памочнікам начальніка штаба палка па шыфравальнай службе. Ён загінуў пад Ленінградам 30 студзеня 1943 года.

**Міхаіл Мельнік** — студэнт II курса быў ваенным следчым дывізіі. Ён загінуў у баі 3 сакавіка 1943 года ў в. Белікава (Краснадарскі край).

**Марына Феадосьеўна Малаковіч** выкладала ў юрыдычным інстытуце гісторыю КПСС, яна кіравала камуністычным падполлем у Калодзішчах пад Мінскам. Гітлераўцы пакаралі яе смерцю ў жніўні 1943 г.

**Аляксей Фралоў,** студэнт II курса, у час вайны быў стралком-радыстам у палку бамбардзіровачнай авіяцыі далёкага дзеяння, гвардыі старшы сержант. Ён загінуў 1 верасня 1943-га.

Праз два тыдні загінуў пад Смаленскам другі старшы сержант, студэнт IV курса **Міхаіл Эпштэйн.** Яго аднакурснік **Уладзімір Дашкоўскі,** радавы, загінуў 8 чэрвеня 1944 года пад Баранавічамі, а студэнт таго ж курса, радавы **Мікалай Марцючэнка** аддаў сваё жыццё за Радзіму ў баі пад Беластокам 8 жніўня 1944 года.

У баях пад Берлінам загінуў 18 красавіка 1945 года выкладчык гісторыі КПСС, маёр **Гіры Матусавіч Гейфман.**

У роднай зямлі і на чужыне назаўсёды засталіся ляжаць мужныя камуністы і камсамольцы—выкладчыкі і студэнты Мінскага юрыдычнага інстытута. Іх імёны занесены залатымі літарамі на мемарыяльную дошку, якая ўстаноўлена ў вестыбюлі юрыдычнага корпуса БДУ.

На мармуровай дошцы 18 прозвішчаў. Гэта далёка не ўсе, хто загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны, з ліку нашых студэнтаў і выкладчыкаў.

У час мітынгу памяці загінуўшых 24 снежня 1978 года, які адбыўся на юрыдычным факультэце, экспанаваўся поўны спіс студэнтаў IV курса 1940-41 навучальнага года. У спісе 60 прозвішчаў. Імёны тых, хто загінуў, напісаны чорным колерам. Іх — 21.

Юнакі і дзяўчаты! Запомніце: кожны трэці.

На мармуровай дошцы пакуль толькі 18 прозвішчаў. Але наша пошукавая работа працягваецца.

Пётр Міронавіч Машэраў вельмі правільна сказаў: «Ніводнае імя воіна, партызана, падпольшчыка, ніводнае імя жанчыны або дзіцяці, якія загінулі ахвярай фашызму, не павінна быць абыйдзена, упушчана або забыта».

Мы ўспрымаем гэтыя словы як загад партыі: ніхто не павінен быць забыты.

Мы ўшаноўваем імёны загінуўшых у імя тых, хто жыве.

Імем Васіля Жудро названа адна з вуліц нашай сталіцы. Студэнты і выкладчыкі-юрысты ганарацца гэтым.

Імёнамі, занесенымі на мемарыял, мы называем свае студэнцкія будаўнічыя атрады. Мы змяшчаем партрэты загінуўшых у насценным друку і знаёмім з іх жыццём і баявымі справамі кожнае новае папаўненне студэнтаў-юрыстаў.

Побач з мемарыяльнай дошкай напісаны праніклёныя словы Юліуса Фучыка:

«Аб адным прашу тых, хто перажыве гэты час: не забудзьце!.. Цярпліва збірайце звесткі аб тых, хто загінуў за сябе і за вас... Я хацеў бы, каб усе ведалі, што не было невядомых герояў, што былі людзі, у якіх было сваё імя, сваё аблічча, свае спадзяванні і надзеі... Няхай жа загінуўшыя ў баі будуць назаўсёды блізкія вам як сябры, як родныя, як вы самі...»

Так! Яны сталі нашымі сябрамі, часцінкай нас саміх. Мы размаўляем з імі ў дні народных урачыстасцей, перапісваемся з іх роднымі і сустракаем іх у сябе. Гэта вучыць юнакоў і дзяўчат 70-х гадоў цаніць мір, умацоўваць дружбу.

**І. ГАРЭЛІК,**
**ветэран Вялікай Айчыннай вайны, прафесар, кансультант групы «Пошук».**



Пісьмо з фронту.



А. М. Фралоў.



А. А. Сакалова.



В. С. Жудро.



У. І. Дашкоўскі.



П. І. Савацееў.



У. І. Срэценскі.




хочацца паспець на прэм'еру спектакля, паглядзець з сябрамі новы фільм. І ў канчатковым выніку часта выходзіць так, што за некалькі дзён да экзамена пачынаецца штурм падручнікаў, бешаны галоп па эпохах і стагоддзях.

— **Чым, па-твойму, адрозніваецца сесія ад уступных экзаменаў!**

— Асаблівай розніцы няма. І тут і там рашаецца лёс чалавека. Пасля ўступных становішся альбо студэнтам, альбо не. Калі ж дрэнна здасі сесію, станеш проста пасрэдным студэнтам, а гэта не вельмі прыемна ўсведамляць. Ці варта было паступаць ва універсітэт, каб цягнуцца недзе ў хвасце?

— **Я з табой цалкам згодна. А наогул ты за сесію ці супраць!**

— У прынцыпе, канешне, стаўлюся да яе станоўча. Для кожнага студэнта — гэта сур'ёзнае выпрабаванне, многае залежыць ад самадысцыпліны. І потым, пасля сесіі — канікулы. Хаця б дзеля іх варта любіць сесію.

**Інтэрв'ю правяла А. ГУДЗЕНКА.**

# Канферэнцыя біёлагаў

На БІЯЛАГІЧНЫМ факультэце прайшла двухдзённая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 60-годдзю БССР і КПБ.

Яркія дасягненні і поспехі нашай рэспублікі ў адзінай сям'і рэспублік Савецкага Саюза. Іменна аб іх пачулі біёлагі захапляючы расказ загадчыка кафедры гісторыі БССР, доктара гістарычных навук, прафесара В. В. Чапко. Вобразна, эмацыянальна, на вялікім і разнабаковым дакументальным матэрыяле было паказана, што поспехі БССР абумоўлены гістарычна, яны непарыўна звязаны з уступленнем Беларусі на шлях сацыялістычнага развіцця.

Асаблівы інтарэс выклікалі матэрыялы аб гісторыі ўтварэння БССР і КПБ, аб слаўных прадстаўніках розных пакаленняў беларускага народа.

Даклады, якія былі заслуханы на канферэнцыі, адлюстравалі таксама дасягненні біялагічных навук, у якія непасрэдны ўклад уносіў і ўносіць біялагічны факультэт. У дакладзе загадчыка кафедры экалогіі і гідрабіялогіі дацэнта В. П. Ляхновіча дана характарыстыка стану і шляху рашэння праблемы цеплавога забруджвання вадаёмаў. Вядома, што цеплавыя і атамныя электрастанцыі скідваюць у вадаёмы вялікую колькасць падагрэтых вод. Як адзначыў дакладчык, сучасныя маштабы развіцця энергетыкі ставяць перад біёлагамі-эколагамі актуальную задачу — адшукаць меры аховы вадаёмаў ад цеплавога забруджвання.

У цэнтры ўвагі канферэнцыі быў даклад загадчыка кафедры заалогіі, прафесара І. К. Лапаціна, спецыяліста ў галіне біялагічнай сістэматыкі. Сістэматыка вырашае, як адзначыў дакладчык, буйныя практычныя і тэарэтычныя праблемы. Першыя звязаны з надзейнасцю распазнавання элементаў сістэмы, другія — з далейшым развіццём тэорыі эвалюцыі, выяўленнем заканамернасцей эвалюцыйнага працэсу і з барацьбой супраць спроб скажэння біялагічнай прыроды сістэмы. Рашэнню гэтых праблем садзейнічае прымяненне матэматычных, біяхімічных, імуналагічных і іншых метадаў.

Аб значэнні прагназіравання хвароб сельскагаспадарчых раслін і аб шляхах навуковай распрацоўкі гэтага пытання ў рэспубліцы гаварылася ў дакладзе загадчыка кафедры батанікі дацэнта А. С. Шуканава. Падкрэслівалася неабходнасць далейшага развіцця тэорыі прагнозу, вывучэння асаблівасцей прагназіравання хвароб асобных раслін з улікам ролі разнастайных фактараў, якія садзейнічаюць паяўленню тых хвароб, якія істотна ўплываюць на ўраджайнасць.

Аглядны даклад дэкана факультэта, прафесара А. Ц. Пікулева прысвячаўся аднаму з актуальных пытанняў сучаснай біяхіміі — механізму дзеяння гармонаў. Былі разгледжаны дыскусійныя ўяўленні аб механізмах рэгулюючага ўплыву гармонаў, якія належаць да розных класаў. Паказаны вартасці і недахопы існуючых гіпотэз.

Сучаснаму стану праблемы пранікальнасці прысвяціў сваё выступленне загадчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл, доктар медыцынскіх навук Я. Ф. Лунец. Было раскрыта значэнне вывучэння пранікальнасці мембран для вырашэння шэрагу медыка-біялагічных пытанняў, у прыватнасці кіравання функцыянальнай актыўнасцю клетак з дапамогай біялагічна актыўных рэчываў і лекавых прэпаратаў.

Вялікую ўвагу прыцягнуў даклад загадчыка кафедры мікрабіялогіі, прафесара Ю. К. Фамічова аб геннай інжынерыі. Карыстаючыся цікавымі ілюстрацыямі, прафесар Ю. К. Фамічоў ясна і даступна абагульніў назапашаны ў сусветнай практыцы навуковы вопыт геннай інжынерыі. І хаця ў цяперашні час эксперыменты яшчэ не выйшлі за межы мікраарганізмаў, але, як гэта было паказана ў дакладзе, ёсць рэальныя перспектывы на аснове метадаў геннай інжынерыі актыўна ўмешвацца ў спадчыннасць жывёл і раслін.

Загадчык кафедры дарвінізму і генетыкі, прафесар А. В. Канстанцінаў азнаёміў удзельнікаў канферэнцыі з данымі аб крыніцах генатыпічнай зменлівасці і іх практычным выкарыстанні. Шырокі агульнабіялагічны аналіз пытання дазволіў падысці да выяўлення каштоўнасцей і перспектыўнасці прымянення розных крыніц генатыпічнай зменлівасці для селекцыйнай работы.

Прайшоўшая на біяфаку канферэнцыя паслужыла своеасаблівай нагляднай справаздачай калектыву факультэта да 60-годдзя БССР і КПБ. Па прапанове дэкана факультэта, прафесара А. Ц. Пікулева прынята рашэнне штогод праводзіць снежаньскія чытанні.

**В. ШАЛАТОНІН,**
**дацэнт.**




# СПАРТЫЎНАЯ РАБОТА: праблемы і задачы

МОЙ СУБЯСЕДНІК — старшыня спартыўнага клуба БДУ імя У. І. Леніна Віктар Паўлавіч Шапялевіч. Я прашу яго расказаць аб выніках спартыўна-масавай работы ў калектывах універсітэта за мінулы год.

— Наогул прайшоўшы год быў нядрэнным для спартыўных калектываў універсітэта. Студэнты-спартсмены занялі прызавыя месцы ў агульнагарадскім лёгкаатлетычным кросе, паспяхова выступілі на першынстве аблсавета ДСТ «Буравеснік». За масавую работу калектыў універсітэта ўзнагароджан пераходным Чырвоным сцягам ЦК ДСТ «Буравеснік».

І ёсць за што. Бо ў мінулым годзе былі падрыхтаваны 4 майстры спорту, 79 спартсменаў-першаразраднікаў, 13 кандыдатаў у майстры спорту, 4304 спартсмены масавых разрадаў.

Паспяхова прайшла і здача норм ГПА. Значкістамі сталі 2548 студэнтаў. Гэта гаворыць аб многім.

Але разам з тым мінулы год выявіў і сур'ёзныя недахопы ў нашай рабоце. Так, па выніках рэспубліканскай міжвузаўскай спартакіяды каманда універсітэта заняла толькі 5 месца.

Прайшоўшая універсітэцкая спартакіяда паказала сур'ёзныя недахопы ў пастаноўцы спартыўна-масавай работы на філалагічным, геаграфічным, факультэце журналістыкі, радыёфізікі і электронікі, хімфаку.

Паглядзім, як жа ідуць справы на філалагічным факультэце ў спаборніцтвах па асобных відах спорту.

На лёгкаатлетычны крос з 206 удзельнікаў прыйшло 158 чалавек. Таму факультэт аказаўся ў канцы табліцы.

На спаборніцтвы па валейболу жаночая каманда факультэта не з'явілася, за што і была знята са спаборніцтваў.

Таксама была знята і жаночая каманда геафака па баскетболу.

**— Як рэагавалі на такое становішча кафедра фізвыхавання, партком універсітэта?**

— 3 студзеня на пасяджэнні спартыўна-масавай камісіі парткома разбіралася пытанне аб пастаноўцы спартыўна-масавай работы на філалагічным факультэце. На пасяджэнне былі запрошаны У. М. Лазоўскі, намеснік сакратара партыйнага бюро, адказны за спартыўную работу ад партбюро і сакратар камітэта камсамола факультэта Ж. Рымкевіч.

У выніку абмеркавання выявілася, што дэканат факультэта і грамадскія арганізацыі пусцілі на самацёк спартыўна-масавую работу на факультэце. Дэканату, партыйнаму і камсамольскаму бюро даручана павысіць адказнасць камсамольцаў за ўдзел у спартыўным жыцці, сістэматычна заахвочваць лепшых спартсменаў.

**— Віктар Паўлавіч, раскажыце аб тым, што прадстаіць зрабіць спортклубу ў гэтым годзе.**

— Наступіўшы 1979 год рыхтуе многа цікавых спартыўных падзей, асноўнай з якіх з'явіцца Спартакіяда народаў СССР. Напярэдадні гэтай спартакіяды адбудзецца рэспубліканская спартакіяда ВНУ БССР. Студэнты, якія паспяхова выступяць на гэтых спаборніцтвах, будуць абараняць спартыўны гонар універсітэта на саюзнай спартакіядзе.

Зараз ужо можна назваць прозвішчы кандыдатаў, якім прыйдзецца абараняць спартыўны гонар універсітэта на саюзнай спартакіядзе. Гэта В. Луней, Т. Шляхто, Л. Клімянцёнак і іншыя.

У гэтым годзе будуць шырэй, чым у мінулым, праводзіцца агляды-конкурсы. Яны дапамогуць паспяхова прапагандаваць фізкультуру і спорт.

**С. АЛЯКСЕЕЎ.**



Ва універсітэцкай бібліятэцы рыхтуюцца да экзаменаў другакурснікі юрфака Аляксандр ДУБАЎ і Мікалай ЕМЕЛЬЯНОВІЧ.
Фота М. Дубовіка.

# На барцоўскім дыване

Канец мінулага года быў адзначан асабіста-камандным першынством па класічнай барацьбе ў праграме XXVII круглагадавой спартакіяды універсітэта, прысвечанай 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Два дні 89 спартсменаў (сярод іх 4 майстры спорту, 8 кандыдатаў у майстры спорту і 16 паршаразраднікаў) абаранялі гонар сваіх факультэтаў. У асабістым заліку пераможцамі ў сваіх вагавых катэгорыях сталі (па ўзрастанню) Н. Беразовін (фізфак), Г. Баранаў (юрфак), А. Міхальчанка (хімфак), А. Гілёў (фізфак), А. Данілевіч, В. Іскандэраў (юрфак), Н. Гарадзішчэнін (фізфак), А. Горзін (юрфак). Агульнакамандныя месцы размеркаваліся наступным чынам: 1 месца — юрыдычны факультэт, які набраў 225 ачкоў, 2 месца — фізічны (175 ачкоў), 3 месца — хімічны (134 ачкі).

Пасля ўручэння дыпломаў на нашы пытанні адказаў суддзя спаборніцтваў, кандыдат у майстры спорту па класічнай барацьбе Валерый Каркаціца.

**— Скажыце, калі ласка, чые спаборніцтвы цяжэй судзіць — навічкоў ці вопытных спартсменаў?**

— Любое змаганне цяжка судзіць. Навічкі спяшаюцца, мітусяцца і дапускаюць памылкі, якія могуць прывесці да траўм. Тут трэба быць уважлівым. Больш вопытныя барцы вядуць барацьбу асцярожна, але пры гэтым узрастае адказнасць суддзі: бо любы няправільна прысуджаны бал можа адыграць рашаючу ролю.

**— Валера, як вы ставіцеся да гледачоў, не перашкаджаюць яны судзейству?**

— Калі на спаборніцтвах многа гледачоў — гэта даказвае, што дадзены від спорту папулярны. Гледачы маральна падтрымліваюць барцоў. За прыгожа праведзены кідок або прыём яны ўзнагароджваюць спартсменаў апладысментамі, і гэта прыемна. Але не ўсе балельшчыкі ведаюць правілы барацьбы і часта абураюцца ацэнкай прыёму або кідка, хаця суддзя правільна ацаніў дзеянні барцоў. Гэтыя непаразуменні ўносяць цяжкасці ў судзейства, адцягваюць ад спаборніцтва.

**— За гэтыя два дні вы бачылі барацьбу многіх спартсменаў. Каго з удзельнікаў вам хацелася б адзначыць?**

— Шмат добрых барцоў выступіла на першынстве універсітэта. Вельмі цяжка адзначыць сярод іх лепшых, але я пастараюся. У першую чаргу — гэта А. Гілёў, прадстаўнік фізічнага факультэта. Добры барэц, да любых сітуацый падыходзіць творча. Фізічна добра падрыхтаван, і калі ён будзе больш працаваць над павышэннем тэхнікі барацьбы, то з яго войдзе вопытны барэц. Можна адзначыць Г. Мальцава (мехмат), А. Міхальчанку (хімфак), А. Гаўруцікава (фізфак).

**— І апошняе. Якія ўражанні аб прайшоўшых спаборніцтвах!**

— Спаборніцтвы прайшлі на высокім спартыўным узроўні, у іх прынялі ўдзел каманды 6 факультэтаў. Нашы гледачы часта былі сведкамі цікавых спаборніцтваў, але яшчэ не ўсе барцы добра падрыхтаваны.

**А. МАРЧАНКА, удзельнік спаборніцтваў.**

## Справы прафсаюзныя

# ШЛЯХ ДА ПОСПЕХАЎ

Прафсаюзная арганізацыя механіка-матэматычнага факультэта, якую ўзначальвае Іван Гром, лічыцца адной з лепшых ва універсітэце.

— Скажыце, калі ласка, што можна асабліва адзначыць у рабоце вашай прафсаюзнай арганізацыі? — з такім пытаннем я звярнуўся да старшыні прафбюро мехмата.

— Прафсаюзы, як гаварыў У. І. Ленін,— гэта школа камунізму. Гэта адзін з важнейшых сродкаў выхавання і прыцягнення студэнтаў да вучэбнай і грамадскай работы. Наша прафсаюзная арганізацыя ўдзяляе асаблівую ўвагу выхаванню ў студэнтаў творчых адносін да вучэбнай, грамадскай і працоўнай дзейнасці. З мэтай актывізацыі прафсаюзнай работы ў групах рэгулярна праводзіцца вучоба прафсаюзнага актыву, наладжана сацыялістычнае спаборніцтва за лепшую вучэбную групу. Студэнты-матэматыкі зацікаўлены ў правядзенні розных мерапрыемстваў. Амаль кожны тыдзень праводзяцца тэматычныя вечары, «агеньчыкі», вечары адпачынку.

— Вядома, што дасягненне выдатных паказчыкаў у вучобе — галоўнае. Што робіцца ў гэтым напрамку?

— Прафбюро факультэта ўдзяляе асаблівую ўвагу рабоце вучэбна-вытворчай камісіі. На базе гэтай і акадэмічнай камісіі камітэта камсамола была створана адзіная акадэмічная камісія факультэта. Раз у месяц яна праводзіць пасяджэнні, на якіх разглядаюцца пытанні аб сацыялістычным спаборніцтве, што праходзіць пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!», заслухоўваюцца справаздачы аб рабоце савета выдатнікаў і інш.

На кожным курсе створаны курсавыя акадэмічныя камісіі, а ў кожнай групе І курса працуюць грамадскія куратары з ліку лепшых студэнтаў III і IV курсаў. Акрамя таго ў групах створаны пасты дапамогі адстаючым і ўстаноўлен строгі кантроль за іх дзейнасцю.

— Як і ў кожнай рабоце, тут, напэўна, маюцца цяжкасці? У чым яны праяўляюцца?

— Па-першае, не ўсё добра абстаіць з праверкай наведвання студэнтамі заняткаў. Не заўсёды прынцыпова адносяцца правяраючыя да гэтай справы.

Яшчэ не заўсёды добраўпарадкаваны чытальныя залы ў інтэрнаце, не арганізуюцца кансультацыйныя пункты, што, безумоўна, у той або іншай меры ўплывае на вынікі сесіі. І на ліквідаванні гэтых недахопаў неабходна сканцэнтраваць максімум увагі і намаганняў.

**Я. ЗАХАР,**
**студэнтка II курса журфака.**

# ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

**агляду-конкурсу палітычнай песні, у якім прынялі ўдзел ансамблі і асобныя выканаўцы з усіх факультэтаў БДУ.**

**Сярод асобных выканаўцаў журы прызнала лепшымі П. Фрэнкеля, Я. Сарадзіса, Т. Слепіцу, якія занялі адпаведна І, ІІ і ІІІ месцы.**

**Сярод ансамбляў І месца прысуджана трыо ІІ курса фізічнага факультэта, ІІ — дуэту Гадун, Нікалас гэтага ж факультэта, ІІІ — дуэту Каляда, Камароў механіка-матэматычнага факультэта.**

**Спецыяльны прыз за аўтарства песень прысуджан студэнту гістарычнага факультэта А. Румянцаву, які выканаў песні «Бяжы, негр, бяжы» і «Табе на ўсё пляваць».**

# ХТО ЗА ГЭТА Ў АДКАЗЕ?

Пачалася сесія — самая напружаная і, відаць, самая складаная пара студэнцкага жыцця. І вось якраз у гэтую пару 76 студэнтаў атрымалі пуцёўкі ў прафілакторый. Здавалася б, бестурботнае, утульнае жыццё ў ім павінна садзейнічаць найлепшай здачы залікаў і экзаменаў. Але... Вось каб не гэтае але.

Пасля снедання, прамерзшы да касцей на 20-градусным марозе, натоўп студэнтаў гадзінамі чакае аўтобуса. Такое ж паўтараецца і ў абед, і ўвечары. На наша пытанне: «Дзе аўтобус?» — адзін адказ: «Не выйшаў з гаража — марозы». А што, хіба для аўтобусаў політэхнічнага інстытута іншы клімат? Яны ж прыязджаюць. Чаму ж студэнты універсітэта павінны дарма траціць дарагі час, псаваць сабе настрой, які, дарэчы, не апошняя рэч перад экзаменамі. Хто за гэта ў адказе?

**Т. ВЯЦКАЯ,**
**студэнтка І курса журфака.**



Чарговая сесія прыйшла ва універсітэт. Яе беспамылкова пазнаеш па невялікіх гаманкіх натоўпах каля дзвярэй аудыторый. Тут спрачаюцца і кансультуюцца, хваляюцца і «хвараюць» за сяброў. І так—на кожным факультэце. Фота М. Дубовіка.

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.